*Валянціна АСТРОГА*

# «НАША НІВА» АБ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ НАПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Як вядома, стан народнай адукацыі на Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі, істотна адставаў ад стану адукацыі цэнтральных губерняў па сваіх важнейшых паказчыках. Гэта тлумачылася ня толькі агульнай сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй Паўночна-Заходняга краю, але і выразнай русіфікатарскай палітыкай царскага ўраду. На Беларусі ўжо фактычна з сярэдзіны XIX стагоддзя не існавала аніводнай вышэйшай навучальнай установы, і таму, улічваючы агульны узровень адукаванасці насельніцтва, увага ў тутэйшым краі надавалася сярэдняй і пачатковай адукацыі. Але апошняя праз нежаданне ўладаў турбавацца аб пашырэнні культуры на нацыянальных акраінах існавала ў вельмі гаротным стане. Віленская навучальная акруга, у склад якой уваходзілі беларускія губерні, займала перадапошняе месца сярод 15 навучальных акругоў Расійскай імперыі. Такое становішча, безумоўна, турбавала прагрэсіўныя колы беларускай грамадзкасці. Не абыйшла гэтую праблему і рэдакцыя адной з найпершых беларускіх газет «Наша Ніва» / «НН» /. Ужо ў першым нумары яна аб'явяціла, што «служыць усяму скрыўджанаму народу». Газета пачала выдавацца з лістапада 1906 г. у Вільні і выходзіла штотыдзень да жніўня 1915 г. У ёй у асноўным друкаваліся матэрыялы аб жыцці беларускай вёскі, адстойваліся патрабаванні градска-палітычнага раўнапраў'я беларусаў, права карыстацца роднай мовою, развіваць на ёй літаратуру і асвету. «НН» шырока і сістэматычна асвятляла і разнастайныя пытанні тутэйшай адукацыі, а таксама і яе цэнтральную фігуру – народнага настаўніка. Мусіць таму на яе забаранялася падпісвацца настаўнікам і вучням Віленскай навучальнай акругі.

Паспрабуем прааналізаваць, як на старонках «НН» за ўвесь час выдання асвятлялася жыццё і дзейнасць народнай школы і настаўніка, ды і стан тагачаснай адукацыі. Першапчаткова зробім статыстычны аналіз школьных матэрыялаў газеты, а потым разгледзім найбольш цікавыя з іх.

За два месяцы 1906 г. у пяці нататках «НН» «фактычна ўздымаліся толькі два пытанні, прысвечаныя адукацыі, а менавіта – аб настаўніцкіх семінарыях і стане народных школ. У наступным 1907 г. тэматыка матэрыялаў пашыраецца амаль у тры разы: разглядаліся пытанні адкрыцця школ і іх матэрыяльнага стану, стварэння «вучыцельскіх» саюзаў, дзейнасць дэпутатаў-настаўнікаў у Дзяржаўнай Думе. Але становішча ў настаўніцкіх семінарыях працягвала цікавіць больш за ўсё, таму гэтай тэме было прысвечана чатыры артыкулы з чатырнаццаці за ўвесь год.

Разам з ростам досведу і папулярнасці газеты расце і аб'ём інфармацыі аб стане тутэйшай адукацыі. У 1908 г. значна пашырылася ў параўнанні з папярэднім годам колькасць нататак на гэтую тэму. За гэты час іх налічваецца 23: настаўнік і царква, стаўленне сялян да адукацыі сваіх дзяцей, школьная статыстыка, матэрыяльны стан настаўніка, звесткі аб школьнай справе па-за межамі края і інш. Галоўнае ж месца займалі пытанні падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для народных школ, асвятленне дзейнасці прафсаюзаў, адносіны паміж дзяржавай і народнай школай.

У 1909 г. назіраюцца тыя ж тэндэнцыі, як і ў 1908: асвятленне разнастайных бакоў школьнай справы ў нашым краі, але тэматыка публікацый пашыралася ў адпаведнасці з часам. На старонках газеты магчыма было сустрэць звесткі аб настаўніцкіх з'ездах, з'яўленне адукацыйных часопісаў, інструкцыі па стварэнню народных школ. Шмат увагі надавалася асвятленню грамадскай дзейнасці настаўніка, семінарыям і курсам, стаўленню насельніцтва да асветы, але больш за ўсё «НН» хваляваў гаротны матэрыяльны стан школы, аб чым адзначалася ў 7 з 22 публікацый, прысвечаных адукацыі за ўвесь год.

У 1910 г. тэматыка публікацый значна скарацілася, але іх колькасць узнялася на 1/3, дасягнуўшы рэкорднай за ўсе гады выдання лічбы – 36 артыкулаў і нататак. Як і раней, пільная ўвага надавалася паведамленням аб адкрыцці школ (палова ўсіх публікацый), матэрыяльным стане, грамадскай дзейнасці настаўнікаў і іх сацыяльнаму статусу. Асаблівасцю з'яўляецца тое, што менавіта з гэтага часу рэдакцыя пачынае шырокае асвятленне сітуацыі, звязанай з мовай выкла-

дання ў школах, адначасова прапагандуючы ідэю пераводу навучання на народную, беларускую мову. Газета за 1911 г. мае ўсяго толькі 17 артыкулаў, галоўныя сярод іх як і раней: адкрыццё школ і праблемы з імі звязаныя, матэрыяльны стан настаўніцтва і яго месца ў грамадстве. У наступным 1912 г. «Наша Ніва» змясціла на сваіх старонках 20 нататак і паведамленняў аб стане беларускай адукацыі, прычым прыярытэт надаваўся пытанням адносін сялян да школы і да настаўнікаў. Дзесці чвэрць усіх публікацый займала школьнае моўнае пытанне. У апошнім перадваенным годзе значная частка матэрыялаў «Нашай Нівы» па праблемах адукацыі на Беларусі прыпадала на асвятленне матэрыяльтнага стану настаўніцтва і ўмоў іх працы (трэць публікацый). Разглядалася таксама і дзяржаўная школьная палітыка ў імперыі, фінансаванне адкрыцця новых школ і др.

На 1914 г. прыпадае 32 паведамленні па разглядаемай тэме, нават нягледзячы на тое, што ужо ў другой палове года пачалася першая сусветная вайна.Працэс адкрыцця школ у вёсках і гарадах прыцягваў найбольшую ўвагу рэдакцыі, але не заставалася яна ў баку і ад асвятлення пытання дзейнасці настаўніцкіх семінарыяў, стану мовы ў школах, падзея настаўніцкага з’езду ў Пецярбурзе. Чытач таксама знаёміўся з настаўнікамі-беларусамі на франтах вайны.

1915 г. быў апошнім годам выдання «НН», у які нягледзячы на шматлікія перашкоды вайсковай цэнзуры, рэдакцыя здолела данесці пэўную інфармацыю да свайго чытача. Дзве трэці матэрыялаў было прысвечана настаўнікам і школе ва ўмовах вайны.

Зараз хацелася б больш падрабязна разгледзець асноўныя праблемы школьнай адукацыі, якія асвятляліся ў «Нашай Ніве» напачатку мінулага стагоддзя. З газеты вынікае, што пастаянным, хвалюючым пытанем была падрыхтоўка настаўнікаў праз семінарыі. Напрыклад, шмат увагі надавалася здарэнню ў Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі ў кастрычніку 1906 г., навучэнцы якой раптоўна ў сярэдзіне навучальнага года спынілі вучобу і раз’ехаліся па хатах. Яны папрасілі папячыцеля Віленскай акругі замяніць дырэктара Гадыцкага-Цвірку, які *«ругаецца як п’яны звозчык на рынку і лезе біцца з кулакамі ня толькі да навучэнцаў, але і да настаўнікаў.»*[1] Ён трымаў у страху ўсю семінарыю. Пазней чытачы даведаліся, што дырэктар семінарыі ўсё ж застаўся на сваёй пасадзе, аднак на іспытах ён паклапаціўся аб тым, каб 10 чалавек было пакінута на другі год. «НН» пісала і аб тым, што ў гэтай жа семінарыі замацаваўся такі звычай: *«усе пісьма да вучэнікоў праходзілі праз рукі дырэктара, каторы чытаў іх.»*[2] Тады вучні вырашылі пазбавіцца ад гэткай «апекі». Справа цягнулася доўга, але семінарысты нарэшце дабіліся права атрымліваць лісты без кантроля. Для вучобы ў настаўніцкія семінарыі прымалі звычайна толькі праваслаўных. У жніўні 1908 г. газета паведаміла, што напраклад, у Панявежскую семінарыю зараз маюць магчымасць паступіць і каталікі.

Акрамя семінарыяў існавалі і іншыя формы падрыхтоўкі настаўнікаў. Напрыклад, гэта былі летнія курсы для «народных вучыцеляў», якія стварала Таварыства «Прасьвета» ў Вільні. Тут чыталіся лекцыі па тэмах: «Методыка рускай мовы», «Курс школьнай гігіены», «Аб рускай гісторыі», лекцыі па біялогіі за плату ад 5 да 10 рублёў. Аб гэтым паведамляла «Наша Ніва» 6 чэрвеня 1908 г.

У 1908 г. былі змешчаны статыстычныя звесткі аб дзяржаўным бюджэце, у тым ліку і па народнай асвеце. *«На народную прасьвету грошай давалі найменш ... расходы міністэрства ваеннага - 225 млн. руб., фінансаў – 331 млн. руб., на народную прасьвету – 34 млн.руб. Мы бедныя таму, што мы цёмныя і цёмныя бо бедныя»*– рабіла выснову газета[3]. Акрамя таго, у адным з нумароў змяшчаўся цікавы падлік, што каб ахапіць агульным навучанем увесь край, трэба адчыніць прыкладна 149 тысяч новых школ. Зразумела, што пры гэткай дзяржаўнай палітыцы, асноўны цяжар выдаткаў клаўся на сялянскія плечы. Большасць абшчын староўча ставілася да асветы і пад час плацілі за навучанне сваіх дзяцей апошнія грошы, але шмат хто лічыў, што *«усё роўна нашыя сыны панамі не будуць, як вазілі гной, так і будуць вазіць»*[4] і таму грошай даваць не хацелі і часцяком адрывалі дзяцей ад вучобы. Няма нічога дзіўнага, што па падліках шведскага статыстыка Сундберга «Колькі ў якім краю Еўропы ёсць неграматных» за 1913 г. у Расіі сярэдняя лічба непісменных на 10 000 жыхароў складала – 6200 чалавек, а ў Нямечыне – 5 душ.[5] Як пісаў да рэдакцыі ў верасні 1911 года народны настаўнік з Гродзенскай губерні, *«няма ў нас больш цяжкай рэчы, як адкрыць ці пабудаваць у вёсцы школу.»*[6]

Адна з тэм, якая разглядалася на старонках газеты – цяжкае матэрыяльнае становішча настаўнішчаў. Якуб Колас пад псеўданімам К.Наднёманец у сваім артыкуле «Аб народным вучыцеле» з абурэннем піша *«... колькі вучыцеляй сядзіць па турмах ... пакутуе ў ссылках на далёкіх акраінах Расіі? А колькі без працы і заробку, галодных, абношэнных, змардаваных, без жаласці выкінутых у ахвяру нуды і пакуты? А за што? За тое, што вучыцель асмеліўся думаць іначай як прыказвае яму цыркуляр начальства, за тое, што імкнуўся праліць света ў цёмную вёску»*[7]

Жахлівую карціну будзённага настаўніцкага жыцця малюе №9 за 1908 г.: *«Што гэта за школка – ні самаму паглядзець, ні людзям паказаць. Дзеці сядзяць на лаўках, што вучыцель сам неяк збіў з дошак, а кніжак дык няма дзе пакласці, дзе ўжо тут навучыць добра пісаць. У класе цёмна, сыра.*

*цесна ... аж дыхаць трудна.»*[8] У другой палове школы жыў настаўнік са сваёй сям'ёй у адной каморцы, «як у катуху … тут і спяць усе, і страва варыцца, і вучыцель працуе сам па вечарах, у цеснаце, у чадзе.» На пытанне, чаму такая дрэнная школа, настаўнік адказвае, што яна ўжо пяты год пераносіцца з адной хаты ў другую, бо сваёй не мае, а нават летась была яшчэ горшая. Часцяком, як пісалі ў газеце, *«вучыцель сам мусіць ваду цягаць і клас прыбіраць, і ў печы паліць, ды яшчэ і трыплачваць са сваёй пустой кішэні.»*[9]. А яна сапраўды была пустой. Напрыклад, у Арлянскім і Дубіцкім народных вучэльнях у настаўнікаў пасля выплаты ўсіх падаткаў засталося 192 руб. 50 кап. За год за гэтыя грошы, як паведамляе далей «Наша Ніва», цяжка прахарчавацца, а аб тым, каб выпісаць газету ці кнігу – няма чаго і думаць. Па іншых звестках, у Вілейскім уездзе вучыцелю трэба жыць за 3 капейкі ў дзень.»[10]

Як паведамляе «Ніва», ў лютым 1914 г. настаўнікам не выдаюць па некалькі месяцаў пенсіі, і далей адзначае, як бы пытае: *«што яны галадаюць – то не дзіва, бо яны настаўнікі, але за што іх дзеці і жонкі церпяць голад?»*[11] Аднойчы на адрас «Нашай Нівы» прыйшоў ліст ад былога настаўніка, які раззлавана пісаў, што гадоў дваццаць таму назад настаўнік атрымліваў 12 руб. 50 кап. у месяц і ня енчыў, а зараз 30, і кажуць, што гэтага мала. У адказ рэдакцыя звярнулася да некаторых народных настаўнікаў, каб тыя напісалі аб сваім бюджэце. У выніку атрымалася наступная карціна: пры сярэднім даходзе 363 руб. 60 кап. у год, сярэдні расход складае 515 руб., а найменшы расход – «жабрацкае жыццё» – 380 руб., ды і пры тым, калі настаўнік не жанаты, мае дармавую кватэру і паліва.[12]

Складаныя матэрыяльныя ўмовы, нагляд за асабістым жыццём з боку дзяржавы і праваслаўнай царквы, рэвалюцыйная сітуацыя ў краіне напачатку XX стагоддзя – ўсё гэта вымушала настаўніцтва шукаць выйсця і «лепшай долі». Адным са шляхоў было стварэнне так званых вучыцельскіх саюзаў, дзейнасць якіх шырока асвятляла газета. Нумар 18 за 1907 г. паведамляў, што ў маі адбылася канферэнцыя прадстаўнікоў нацыянальных вучыцельскіх саюзаў, у якой прымала ўдзел і беларуская дэлегацыя. На канферэнцыі была прынята праграма агульных дзеянняў.[13]

Са старонак «Нашай Нівы» можна даведацца і аб устаноўчым з'ездзе беларускіх настаўнікаў і стварэнні імі «Беларускага вучыцельскага саюза» з наступнымі мэтамі :

*«1. Перастройка дзела народнага абразавання на шырокіх, свабодных дэмакратычных пачатках дзеля народа ...*

*2. Увод у школу абучэння на роднай беларускай мове ...*

*3. Незалежнасць школы і вучыцеля ад рознага начальства.»* [14]

Аднак на з'ездзе народных настаўнікаў, які адбыўся ў Пецярбурзе напрыканцы 1913 г., як з сумам паведамляла рэдакцыя газеты, ніводзін беларус не ўзяўся за абарону народа *«... ён баяўся. Векавы ўціск забіў у ім гордасць чалавечую»*[15]

Як ужо адзначалася, дзяржава з падазронасцю ставілася да розных праяў грамадскай актыўнасці, таму не дзіва, што «Наша Ніва» паведамляла і аб рэпрэсіях у дачыненні да актывістаў-настаўнікаў: *«3 мая 1908 г. Віленская судзебная палата разглядала справы народных настаўнікаў Мінскай губерніі. Два гады таму некалькі вучыцелей з'ехаліся ў сяле Мікалаеўшчыне. Па даносу аднаго чалавека прыехала паліцыя, рабіла вобыскі ... забрала праграму вучыцельскага саюза і праграму, напісаную вучыцелямі. Вучыцеляў выгналі са службы і ўзялі пад надзор паліцыі. Да суда былі прыцягнуты 5 чалавек. З іх два ўжо ў Амерыцы. Судзіць будуць трох»*[16]

Моцным кантрастам выглядае становішча настаўніцтва ў іншай імперыі – Нямецкай, дзе на чарговым з'ездзе нямецкіх настаўнікаў *«імператар Вільгельм загадаў устроіць для вучыцеляў прадстаўленне ў сваім тэатры і сам туды прыехаў. Нямецкія народныя вучыцялі збіраліся ня першы раз ... і цяперашні ўрад, разумеючы, якую вагу мае свядомая і шчырая праца народнага вучыцеля, ня робіць вучыцельскім з'ездам ніякіх перашкод.»*[17]

Цікаўныя звесткі аб настаўніцкай актыўнасці можна пачарпнуць з нататкі, у якой паведамлялася, што ў в.Слабада Віленскага павету *«маладзы і вельмі працавіты настаўнік праз усю зіму 1908-09 гг. рабіў у тутэйшай школе лекцыі, чытанні для народу аб розных цікавых справах – паказваў пекныя малюнкі»*, а адмыслова мужыкам чытаў аб тым, якую *«шкоду робіць гэты страшны вораг людзей гарэлка»*. У выніку, мужчыны далі згоду, што адгэтуль піць ня будуць, прычым яшчэ прасілі, каб вучыцель парупіўся аб адкрыцці ў іх «Таварыства трэзвасці».[18]

А ў лісце ад жыхароў в. Асавы Барысаўскага павету з удзячнасцю паведамлялася, што дзякуючы старанням *«вучыцеля Жоглы і іншых лепшых людзей і мы, як людзі, святкавалі Новы год не ў карчме, як гэта бывала даўней, а ў сваей школе, слухаючы спевы і дэкламацыю нашых дзетак, старанна прыгатаваных да гэтага вучыцелям і свяшчэннікам.»*[19]

Не заставаўся абыякавым вясковы настаўнік і да іншых сялянскіх праблем, будучы вельмі патрэбным чалавекам на мужыцкіх сходах. Як піша газета, *«народ верыць вучыцелям і шмат*

*пасылае іх у Дзяржаўную Думу, каб адваяваць зямлю і свабоду, абараніць мужыцкае права і скінуць ярмо цяжкага чыноўніцкага кіравання.»*[20] У Думе настаўнікі злучыліся ў «трудавую групу» (Працавітую Грамаду). Адказам ураду было прыняцце закону, які абмяжоўваў правы настаўнікаў. *«Вучыцелі надта мала маюць можнасці быць выбранымі, ім нават забаранілі хадзіць на мужыцкія сходкі»* – чытаем у «Нашай Ніве».

Як ужо адзначалася, з 1910 году пачала ўсё шырэй з'яўляцца інфармацыя аб сітуацыі з беларускай мовай ў тутэйшых школах. Аўтары публікацый прыводзілі шматлікія доказы самастойнасці мовы, пераконвалі ў неабходнасці навучання менавіта на ёй, бо яна, у адрозненні ад польскай ці расійскай, дазваляе дзецям зразумець сутнасць вучэбных прадметаў. Яскравым сведчаннем гэтага можа быць выпадак, апісаны ў нататцы Лемяша «Чужая мова»[21] *На ўроку «Закона божьего» праваслаўны святар распавядае пра «благие деяния Бога». Вучні яго не могуць зразумець: «Чаму Бог робіць благое, чаму ён благі?» Па-беларуску «благі» – кепскі, дрэнны. А па-руску - добры. У выніку, дзеці вызубрываюць, не разумеючы сэнсу, а на пытанні святара «Почему Бог благой?» – прыдумляюць: «таму, што пусціў на зямлю д'ябла . Таму, што ў гэтым годзе бульба не ўрадзіла і г.д.»*

Нельга абмінуць і ваенную тэму, якая з`явілася на старонках «Нашай Нівы» са жніўня 1914 г. і з цягам часу ўсё больш і больш уплывала на характар і змест паведамленняў. Натуральна, што і школа ўрэшце рэшт шчыльна звязалася з гэтымі падзеямі: мабілізацыя настаўнікаў, ператварэнне школ у шпіталі, стварэнне школьных дружын дапамогі сем'ям пакліканых на вайну. Паведамлялася, што 4 000 настаўнікаў царкоўна-прыходскіх школ забрана ў войска.[22] Усе пакліканыя на ваенную службу народныя настаўнікі *«будуць усяроўна атрымліваць сваю пенсію ці самі, ці іх сем'і. Месцы, на якіх яны служылі, астаюцца за імі»*[23] Газета ўжо з верасня 1914 г. пачала апавядаць аб актыўных беларускіх культурных дзеячах, пакліканых у войска. Сярод іх быў Я.Колас, *«паэт- лірык, родам з Міншчыны, народны вучыцель»*[24]

Такім чынам, відавочна, што «Наша Ніва» даволі стала і сістэматычна, у кожным другім альбо трэцім нумары ўдзяляла ўвагу пытанням развіцця народнай асветы на Беларусі. За дзесяць гадоў існавання, па нашых падліках, было надрукавана каля 200 нататак, артыкулаў і паведамленняў, у якіх адлюстроўвалася дзяржаўная адукацыйная палітыка. З гэтых публікацыяў выразна паўстае, на жаль, сумная, але даволі аб'ектыўная карціна будзённага жыцця народнай школы і народнага настаўніка.

## Літаратура:


1. Наша Ніва. 1906. 16 кастрычніка. С.4.
2. Наша Ніва. 1907, 8 чэрвеня. С.6.
3. Наша Ніва. 1908, 6 чэрвеня.С.3.
4. Наша Ніва. 1909, 16 красавіка. С.5.
5. Наша Ніва. 1913. 16 мая.С.4.
6. Наша Ніва. 1911, 1 верасня. С.4.
7. Наша Ніва. 1907. 25 мая. С.6.
8. Наша Ніва. 1908, 25 красавіка.С.6.
9. Там сама.
10. Наша Ніва. 1907, 21 чэрвеня. С.7.
11. Наша Ніва. 1914. 27 лютага. С.2.
12. Наша Ніша. 1910. 12 жніўня. С.4-5.
13. Наша Ніва. 1911. 21 мая.С.8.
14. Наша Ніва. 1907.8 чэрвеня.С.6.
15. Наша Ніва.1914, 24 студзеня. С.1.
16. Наша Ніва.1908. 8 чэрвеня, С.6.
17. Наша Ніва. 1912, 14 чэрвеня, С.2.
18. Наша Ніва. 1909, 2 красавіка. С.10.
19. Наша Ніва. 1912, 12 студзеня.С.4.
20. Наша Ніва. 1907, 25 студзеня.С.7.
21. Наша Ніва. 1913, 31 мая.С.3.
22. Наша Ніва.1915, 9 красавіка.С.4.
23. Наша Ніва. 1914, 11 верасня,С.2.
24. Наша Ніва. 1914. 18 верасня. С.2.